# Уплыў грамадскіх аб'яднанняў другой паловы XIX — пачатку XX ст. на станаўленне палітычнай думкі беларусаў

*Даўгач Т. В., студ. V к. БДПУ ім. М. Танка,*
*навук. кір. Рацько А. Ф., канд. гіст. навук, дац.*

Канец XIX — пачатак XX ст. многія гісторыкі справядліва называюць перыядам другога беларускага Адраджэння. Назіраецца абуджэнне нацыянальнай свядомасці, складаюцца перадумовы фарміравання грамадскай супольнасці. На думку М. А. Сакаловай, значную ролю ў гэтым працэсе адыгралі наступныя групы фактараў:змены ва ўнутранай палітыцы ўрада, а таксама пашырэнне пазітывісцкай ідэалогіі сярод апазіцыйна настроеных колаў грамадства [1,с. 29]. Царская бюракратыя разумела, што неабходна ствараць прастору для ажыццяўлення грамадскай дзейнасці, таму ўжо ў пачатку 60-х гг. XX ст. быў прыняты шэраг законаў, якія спрашчалі працэдуру рэгістацыі дабравольных таварыстваў. Аднак краіна, імкнучыся любой цаной захаваць самадзяржаўе, зацвярджала ўказы і пастановы, якія абмяжоўвалі прыватную ініцыятыву.

Самаарганізацыя грамадскіх сіл у Беларусі пачалася са стварэння легальных арганізацый. Адной з традыцыйных форм грамадскіх аб'яднанняў у той час былі гарадскія грамадскія і саслоўныя сходы. У 70-я гг.падаецца шмат прашэнняўабадкрыццiклубаў у Мінску, Навагрудку, Ашмянах, Барысаве, Пінску. Змяняецца і характаріхдзейнасці: назіраеццапераход ад картачныхгульняў і падобныхспраў да зборуахвяраванняў для пацярпелых ад войн, стыхійных бедстваў, на ўладкаваннетэатраў, будаўніцтвапомнікаў.

Нацыянальная свядомасць беларусаў фарміравалася праз асветніцкую дзейнасць айчыннай інтэлігенцыі, а культурна-асветніцкія мэты паступова пераўтвараліся ў палітычныя лозунгі. У канцы XIX ст. ствараюццагурткі «Беларускайнароднайасветы», арганізаваныя студэнтамі-беларусамі. Яны існавалі ў Вільні, Гродне, Маскве, Мінску, Пецярбурзе. На аснове культурна-асветніцкіхгурткоўзімой 1901–1902 гг. у Пецярбургу ствараецца арганізацыя пад назвай Беларуская рэвалюцыйная партыя (БРП).

У канцы XIX ст. ідзепрацэсразвіццяпольскагаграмадска-палітычнагаруху ў Беларусі.На палітычнаежыццеБеларусіаказвалаўплыў польская партыя «Пралетарыят». На тэрыторыі Заходняй Беларусі ўзнікае сацыялістычны гуртох маладых інтэлегентаў, які знаходзіцца пад уплывам Польскай партыі сацыялістаў.

Але сапраўдная актывізацыя дзейнасці адбылася ўжо пасля рэвылюцыі 1905–1907 гг. Арганізоўвалісядэманстрацыі і шэсцірабочых, забастоўкі.

Дзейнасць польскіх палітычных партый на тэрыторыі Беларусі не насіла масавага характару. У асноўным гэта былі невялікія гурткі, якія займаліся друкаваннем і распаўсюджваннем нелегальнай літаратуры. Аднак была праведзена пэўная агітацыйная работа, якая пазней забяспечыла прыхільныя адносіны насельніцтва да сацыялістычных ідэй [3, с. 21–22].

У канцы XIX — пачатку XX ст. адным з актыўныхудзельнікаўграмадска-палітычнагажыццястановіццацарква.У гады ўздыму рэвалюцыі актывізаваў сваю дзейнасть каталіцкі касцёл на тэрыторыі Беларусі. Прычамягодзейнасць была накiравана ў сацыяльнае русла [2, с. 24].Так, духавенства імкнулася да захаваннядабрабытупамешчыкаў-католікаў і з гэтаймэтайадцягвалапаслухмянае яму сялянства ад аграрных хваляванняў i надавала сялянскамурухунацыянальныя тэндэнцыі, накіроўваласупрацьправаслаўя. Значнуюфінансавуюпадтрымкудзейна сціпартый і грамадскіхарганізацыйаказвалі і праваслаўныябрацтвы.

Такім чынам, працэс фарміравання легальных грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі быў запаволены. Прычына таму — унутраная палітыка царызму, накіраваная на падаўленне дэмакратычнай ініцыятывы, а таксама разрозненнасць і супярэчнасці ў ліку саміх ініцыятараў стварэння арганізацый. Ва ўмовах дастаткова вузкай прасторы для дзейнасці асноўнымі іх метадамі былі прапаганда ідэй сярод насельніцтва, акцыі дабрачыннасці, арганізацыя банкетаў, зрэдку арганізацыя забастовак і стачак рабочых. Істотным адрозненнем грамадскага жыцця беларускіх зямель ад такіх жа працэсаў у межах імперыі было тое, што ў Беларусі назіралася супрацьстаянне праваслаўнага і каталіцкага кліру. Аднак удзел прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў садзейнічаў кансалідацыі грамадства. З гэтых «непалітызаваных» арганізацый выйшлі свядомыя асобы, якія сфармулявалі канкрэтныя палітычныя мэты і аказалі значны ўплыў на ход гісторыі Беларусі.

## Літаратура


1.Сакалова, М. Легальныя грамадскія арганізацыі Беларусі ў 70–90-я гг. XIX ст. / М. Сакалова // Беларускі гістарычны часопіс.— 1996.— № 3.

2. Пуцік, У. С. Указ аб верацярпімасці і актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці рэлігійных канфесій у Беларусі/ У. С. Пуцік // Весці БДПУ.— 2007.— № 3.— Серыя 2.

3. Па матэрыялах: Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX — пачатак XXI ст.): матэрыялы рэсп. навук. канф. (Гродна, 23–24 кастр. 2008 г.) /ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: І. І. Коўкель (адк. рэд.) [і інш.].— Гродна: ГрДУ, 2009.

4. Забаўскі, М. М.Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.): манаграфія / М. М. Забаўскі.— Мінск:БДПУ, 2008. — 267 с.

5. Бич, М. Развитие социал-демократического движения в Беларуси в 1883–1903 гг.— Минск, 1973.